Н. А. Апанасовіч

# Проза Вячаслава Адамчыка ў ацэнках сучаснага літаратуразнаўства

В. Адамчык – майстар беларускай прозы XX стагоддзя, чый творчы лёс доўжыўся больш за 40 гадоў, а выхад кожнага твора прыцягваў увагу чытачоў і літаратуразнаўцаў. Проза пісьменніка актыўна вывучалася і аналізавалася ў савецкі перыяд, мела як адназначна станоўчыя, так і крытычныя ацэнкі.

Былі вызначаны адметныя рысы мастацкай манеры В. Адамчыка: «канцэптуальная эпічнасць», цікавасць да бытапісальніцтва, моцны драматычны пачатак, асэнсаванне ролі выпадковасці ў лёсе чалавека, жывапісна-паэтычнае ўспрыняцце свету, спалучэнне гістарычных пластоў і інш. Аналізавалася не толькі навелістыка, але разглядаліся і мастацкія вартасці раманаў. У канцы 1970–1980-х гг. друкуюцца творчыя партрэты пісьменніка, зробленыя В. Івашчанкам, Г. Далідовічам, С. Андраюком, Я. Лецкам.

З пазіцый сучаснага літаратуразнаўства проза В. Адамчыка актыўна пачала пераглядацца ў канцы 1990–2000-х гг.

Спроба перапрацоўкі з новага пункта погляду матэрыялаў маштабнага манаграфічнага даследавання творчасці празаіка, зробленага ў кнізе «Хараство і боль жыцця: нарыс творчасці В. Адамчыка» (1985), праведзена Я. Лецкам у нарысе «Зрухі жыцця і літаратуры. Творчы партрэт Вячаслава Адамчыка» (2011). Даследчык засяродзіў увагу на мастацкім баку твораў, псіхалагічна дакладных і супярэчлівых характарах, на смелай і бескампрамісна-праўдзівай пазіцыі пісьменніка, проціпастаўленай партыйна-ідэалагічнай рыторыцы сацыялістычнага рэалізму. Нягледзячы на тое, што працы Я. Лецкі не пазбаўлены пэўнай тэндэнцыйнасці, яго даследаванні з'яўляюцца глыбокім і грунтоўным асэнсаваннем творчасці празаіка.

Крытычна даследаваў творчасць пісьменніка і В. Каваленка, які прысвяціў гэтаму шматлікія артыкулы, а таксама нарыс у 4-томнай «Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя», выдадзенай НАН Беларусі ў 2000-х гг. Шмат публікацый крытыка прысвечана раманнаму цыклу В. Адамчыка. Асэнсоўваючы лёсы персанажаў, В. Каваленка імкнецца падтрымаць пазіцыю пісьменніка і зразумець ягонае жаданне не выносіць адкрытага прысуду сваім героям, згаджаючыся з тым, што і на сучасным этапе апісаны гістарычны перыяд аб'ектыўна, без палітыка-ідэалагічных стэрэатыпаў не пераасэнсаваны, а яго складанасць патрабуе як панарамнага, так і аналітычнага бачання.

Неабходна згадаць і выдатную метафарычную характарыстыку «птах з падрэзанымі крыламі» [1], дадзеную В. Каваленкам аднаму з галоўных герояў тэтралогіі Міцю Корсаку. Гэтая метафара сімвалічна ахарактарызавала і лёс усёй беларускай інтэлігенцыі, прадвызначаны гістарычнымі абставінамі першай паловы ХХ стагоддзя.

Канцэптуальна і грунтоўна даследавалася творчасць В. Адамчыка ў літаратурна-крытычнах працах М. Тычыны. Глыбокія развагі навукоўцы былі прысвечаны дасягненням празаіка ў кнігах «Змена квадры» (1983), «Час прозы» (1988), «Карані і крона: фальклор і нацыянальная спецыфіка літаратуры» (1991), «Народ і вайна» (2015). У артыкуле «Развітанне з сялянскай Атлантыдай» (2003) М. Тычына дае аглядны і грунтоўны аналіз вобразнай прасторы прозы пісьменніка [2].

Адзначым, што раманная спадчына празаіка пачала грунтоўна даследавацца пасля выхаду першага твора «Чужая бацькаўшчына» (1977). І адразу ж выявілася праблемнае поле літаратуразнаўчай палемікі: наколькі значнай і каштоўнай атрымалася спроба В. Адамчыка раскрыць і асэнсаваць тэму нацыянальнага самавызначэння беларусаў не праз гераічнае, а праз зварот да будзённасці, штодзённага быцця звычайных вяскоўцаў у Заходняй Беларусі – на прыкладзе драматычных людскіх лёсаў.

З паступовай публікацыяй усіх чатырох раманаў даследчыкі пачалі разглядаць іх як часткі цэльнага цыкла і ў меншай ступені засяроджваць увагу на асобных творах. Вывучэнню раманаў прысвяцілі свае працы А. Рагуля, П. Дзюбайла, В. Генаш, М. Тычына, В. Каваленка, С. Андраюк, Я. Лецка, Н. Суддзева, Т. Грамадчанка, Л. Корань, Г. Тычко, В. Бароўка, А. Мельнікава, Ю. Шчука і інш. Гэтымі навукоўцамі вывучалася ідэйна-тэматычная і мастацкая спецыфіка раманаў, сістэма вобразаў і іх увасабленне ў эпасе, адметнасць аўтарскай манеры. Засяроджвалася ўвага на пераемнасці традыцый беларускай, рускай, польскай і іншых еўрапейскіх літаратур. Г. Тычко закцэнтавала ўвагу на стрыжнёвай для раманнага цыклу тыпалагічнай трыядзе: *зямля – бацькаўшчына – дзяржаўнасць* і яе ўніверсальнасці для ўсіх літаратур свету [3, с. 201].

Больш актыўна ў 1990–2000-я гг. літаратуразнаўцы пачалі звяртацца і да складанага гісторыяграфічнага патэнцыялу раманнага цыклу. В. Адамчык закрануў, адным з першых у беларускай літаратуры, шэраг падцэнзурных у савецкі час тэм: узаемадзеянне насельніцтва Заходняй Беларусі з польскімі і савецкімі ўладамі, жыццё мірнага насельніцтва на акупаванай тэрыторыі ў час Вялікай Айчынай вайны, праблемы калабарацыі.

Гэтыя аспекты аналізавалі В. Каваленка, М. Тычына, Г. Тычко, Л. Корань, А. Мельнікава, Ю. Шчука. Літаратуразнаўцы звяртаюць увагу на выяўленне ў раманах паняцця «свой-чужы», на маштабах і глыбіні паказу нацыянальнай і духоўнай катастрофы.

У артыкуле «Што значыць цяпер чалавек?..» (па старонках раманаў В. Адамчыка)» (1996) Л. Корань падкрэслівае неабходнасць вывучэння спрэчных тэм беларускай гісторыі, нацыянальнага лёсу, якія аб’ектыўна разглядаць у савецкі час было немагчыма. Такія тэмы ўзняты і паказаны В. Адамчыкам праз неадназначныя і спрэчныя вобразы, сфарміраваныя, аднак, ходам самой гісторыі, прадвызначаныя жыццём у рэаліях Заходняй Беларусі [4, с. 173–174, 176–178].

Праблематыка народазнаўства і этнаграфізму, якую вылучыла В. Бароўка і прадставіла ў манаграфіі «Мастацкае народазнаўства ў беларускай літаратуры ХХ стагоддзя (на матэрыяле прозы)» (2009), ізноў прыцягнула ўвагу да раманаў В. Адамчыка як да каштоўнай крыніцы па вывучэнні народнага жыцця. Заходнебеларускі кантэкст твораў, падрабязны і дэталёвы зварот да бытапісальніцтва, паказ звычайных штодзённых клопатаў вяскоўца для сучасных даследчыкаў (В. Каваленка, Г. Тычко, В. Бароўка, Н. Дамброўская і інш.) – важкі матэрыял па асэнсаванні беларускага характару, нацыянальнай культуры і менталітэту.

Вывучэнне мастацкай манеры пісьменніка ў кантэксце творчасці шасцідзясятнікаў зроблена Н. Дамброўскай у межах дысертацыйнага даследавання і манаграфіі «Проза Вячаслава Адамчыка: родава-жанравы і стылявы аспекты» (2009). Навукоўца адзначае такія рысы ў творах пісьменніка, як аўтабіяграфізм, лірызм і псіхалагізм, «жывапісна-рэчыўнае» ўспрыняцце прасторы, схільнасць да сузірання і філасафічнасці, робіць параўнанне персанажаў В. Адамчыка і Л. Талстога паводле вобраза «прыроднага» чалавека.

Многія даследчыкі і ў савецкія часы, і на сучасным этапе звяртаюць увагу на каларытную, яскравую, насычаную народнымі моўнымі элементамі мову твораў празаіка, аснову якой склала дыялектная гаворка заходнебеларускага краю. Дысертацыйнае даследаванне спадчыны пісьменніка ў лінгвістычным аспекце правяла А. Васілеўская.

Творчасць В. Адамчыка і сёння з’яўляецца актуальнай і запатрабаванай, актыўна і плённа пераглядаецца з пазіцый сучаснага літаратуразнаўства. Сярод асноўных кірункаў такога пераасэнсавання вылучаюцца наступныя: ацэнка твораў В. Адамчыка як крыніцы мастацкага народазнаўства; аналіз адлюстравання пісьменнікам падцэнзурнай у савецкі перыяд тэматыкі; даследаванне

спецыфікі мастацкай манеры празаіка ў кантэксце творчасці «шасцідзясятнікаў» і іх наступнікаў; вывучэнне аналогій і разыходжанняў у традыцыях нацыянальнага і замежнага эпасу – найперш у форме раманных цыклаў.

## Літаратура

1. *Каваленка, В.* Птах з падрэзанымі крыламі / В. Каваленка // Полымя. – 1992. – № 5. – С. 235–247.

2. *Тычына, М. А.* Развітанне з сялянскай Атлантыдай. Вобразны свет Вячаслава Адамчыка / М. А. Тычына // Роднае слова. – 2003. – № 8. – С. 4–8.

3. *Тычко, Г. К.* Беларуская літаратура XIX–XX стагоддзяў: час і асобы: вучэб. дапам. / Г. К. Тычко. – Мінск: БДУКМ, 2010. – 267 с.

4. *Корань, Л.* «Што значыць цяпер чалавек?…»: па старонках раманаў В. Адамчыка / Л. Корань // Цукровы пеўнік / Л. Корань. – Мінск, 1996. – С. 169–179.